Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

21 СНЕЖНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА № 52 (15503)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# «МАЛАДЗЁЖНЫ АЛІМП МІНШЧЫНЫ»

**Пад такой сімвалічнай назвай на Барысаўскай зямлі дэбютаваў абласны форум, на якім ушанавалі маладзёжныя арганізацыі і клубныя фарміраванні за выдатныя паказчыкі ў рабоце па выніках года. Упершыню самыя актыўныя маладыя людзі Міншчыны розных накірункаў дзейнасці сабраліся ў адным месцы, у адзін час і з адной мэтай.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сапраўднае свята падарылі моладзі аддзел па справах моладзі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама, ДУ «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці», Барысаўскі райвыканкам і АКГА «БРСМ». Вітала «гарантаў светлай будучыні» Міншчыны і прафесійная артыстка беларускай эстрады Паліна Смолава.

Адкрыла форум выстава «Дзяржаўная маладзёжная палітыка — ведай і ўдзельнічай»: на стэндах была прадстаўлена інфармацыя аб дзейнасці некаторых грамадскіх арганізацый і клубаў. Тут жа можна было пазнаёміцца з творчасцю маладых мастакоў і фатографаў — іх работы былі прысвечаны роднай Міншчыне.

— Моладзь сёння ў Мінскай вобласці складае больш як 27 працэнтаў насельніцтва, — гаворыць начальнік аддзела па справах моладзі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінаблвыканкама Аляксандр Шлыкаў. — Таму справядліва будзе сказаць: сёння Міншчына — маладая вобласць. А маладая, значыць перспектыўная. Сапраўды, маладыя людзі ахвотна ўдзельнічаюць у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці нашай вобласці. Яны ўжо маюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта ж мерапрыемства накіравана толькі на стымуляванне працоўнай і сацыяльнай актыўнасці маладых грамадзян.

Заслужаныя ўзнагароды атрымалі пераможцы конкурсаў на «Лепшы студэнцкі атрад» і «Маладыя перадавік уборачнай кампаніі 2007 года», а таксама лепшыя клубныя, грамадскія маладзёжныя фарміраванні па розных намінацыях. Паводле слоў арганізатараў форума, намінацыі дакладна акрэсліваюць сацыяльны, працоўны вектар работы грамадскіх маладзёжных арганізацый. Першае месца ў намінацыі «Лепшы будаўнічы атрад» атрымаў атрад «Буравеснік» (Слуцкі раён), «Лепшы сельскагаспадарчы атрад» — «Ігумень» (Чэрвеньскі раён), «Лепшы педагагічны атрад» — «Лепельчанка» (Маладзечанскі раён), «Лепшы наймальнік» — будаўнічае ўпраўленне № 105 ААГ «Салігорскпрамбуд», «Лепшы валанцёрскі атрад» — эколага—валанцёрскі атрад «Трывожныя сэрцы» (г. Барысаў), «Лепшы клуб ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі» — «Вектар» (г. Жодзіна), «Лепшы маладзёжны атрад аховы правапарадку» — атрад Салігорскага раённага камітэта ГА «БРСМ», «Лепшая маладзёжная інфармацыйна прапагандысцкая група» — «Моладзь і час» (Маладзечанскі раён), «Лепшы раённы Савет ГА «БРПА» — Барысаўскі раённы Савет, «Лепшы клуб юных выратавальнікаў і пажарных» — «Тушылка» (Клецкі раён), «Лепшы клуб маладой сям'і» — «КВІМС» (Бярэзінскі раён), «Лепшы сацыяльны праект для дзяцей і моладзі» — «Абласны Міжнародны летнік маладзёжнага актыву» (Любанскі раён), «Лепшы шматпрофільны перасоўны маладзёжны цэнтр» — «Імпульс» (г. Салігорск).

— Маладзёжны перасоўны цэнтр «Імпульс» створаны аддзелам па справах моладзі Салігорскага гарвыканкама ў мэтах удасканальвання арганізацыі работы з моладдзю ў вёсцы. Ужо на працягу года амаль ва ўсіх рэгіёнах працуюць падобныя цэнтры, — расказвае ініцыятар ідэі стварэння цэнтраў Аляксандр Шлыкаў. — Работа іх заключаецца ў аказанні аднаразовай юрыдычнай, медыцынскай, бытавой дапамогі жыхарам аддаленай ад горада вёскі, арганізацыі для мясцовага насельніцтва інфармацыйных, спартыўна-аздараўленчых, культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Гэта, на мой погляд, надзвычай эфектыўная форма работы з вясковай моладдзю.

— Мы па просьбах мясцовых жыхароў прывозім цырульнікаў, маладыя дзяўчаты выстройваюцца ў чэргі, каб зрабіць манікюр, — дадае непасрэдны арганізатар усіх выездаў цэнтра «Імпульс» Ірына Круковіч. — У рамках нашага праекта не так даўно з'явілася новая творчая пляцоўка «Шанец», дзе кожны малады чалавек можа праявіць сябе пачынаючым артыстам, маецца спартыўная пляцоўка «Стыль вуліц» (ролеры і скейтары Салігорска робяць паказальныя выступленні, а пасля праводзяць конкурс паміж вясковай моладдзю). Акрамя таго, мы цікавімся тым, якім бачыць у будучым вясковая моладзь свой населены пункт, таму правялі конкурс «Мая вёска ў будучым» (узялі ўдзел больш як 120 дзяцей). 20 маладых сем'яў сталі ўдзельнікамі спаборніцтва «На старт усёй сям'ёй». Яшчэ, прыкладна так, як на абласным форуме, ушаноўваем моладзь, якая жыве ў той вёсцы, куды мы накіроўваемся. Ёсць жаданне, ёсць падтрымка і, самае галоўнае, запатрабаванасць у дадзеным праекце. А запатрабаваны ён не толькі вясковай моладдзю, але і гарадской (ім цікава выязджаць у вёскі, заводзіць новыя знаёмствы). Аб гэтым сведчыць канцэрт «Моладзь Салігоршчыны для жыхароў вёскі», які прайшоў на «ўра».

— На «Алімп» узышлі толькі 13 маладзёжных арганізацый (адпаведна колькасці намінацый), але намінаваных было значна больш, — падводзіць вынікі Аляксандр Віктаравіч. — Мы ўпэўненыя, што гэты форум стане традыцыйным і штогадовым, а колькасць намінацый будзе павялічвацца, каб уключыць усе катэгорыі моладзі, якія бяруць непасрэдны ўдзел у развіцці нашай вобласці.

**Надзея ДРЫЛА.**

Выпрабавана на сабе

# Як я працаваў прамоўтарам

**— Дзень добры! Атрымайце ў падарунак фен! Для гэтага вам неабходна ўсяго толькі набыць тавараў нашай фірмы на суму... — чапляўся да людзей у краме на мінулых выхадных журналіст «Чырвонай змены». Не, не падумайце, што ён звар'яцеў. І на хлеб з малаком яму грошай хапае ад рэдакцыі. То чаго ж яму дома не сядзелася ў выхадныя? Усё проста — як кажуць у народзе, галава нагам злодзей. Вось і журналісту прыспела часова перакваліфікавацца ў замежнай прафесіяй «прамоўтар» і ва «ўікэнд» не на канапе перад тэлевізарам валяцца, а таптаць падлогу гандлёвага цэнтра ды прыставаць да людзей з рознымі прапановамі. Як тое было — чытайце з першых вуснаў.**

...Навошта мне гэта «прамоўтарства» здалося? Ай, і сам не ведаю. Проста надакучыла раз-пораз шмат ад каго са сваіх знаёмых студэнтаў чуць пра грошы, атрыманыя за ўдзел у розных рэкламных акцыях: нехта чыпсы ў супермаркеце раздаваў, нехта рэкламныя паперкі на вуліцах, а нехта так проста горла драў у крамах, расхвальваючы якасці новых гатункаў тавараў. Вось я і падумаў: «Хіба я горшы? Трэба і мне шчасця паспытаць у гэтай дзейнасці, пакуль малады. А то на пенсію выйду, дык хто мяне прамоўтарам працаваць пусціць?..»

Усё, трэба пачынаць рэалізоўваць напалеонаўскі план па заваяванні ніжэйшых звёнаў рэкламнага бізнэсу. Тэлефаную знаёмай, якая рэгулярна ўдзельнічае ў розных акцыях, і атрымліваю ад яе адрас канторы, якая вярбуе прамоўтараў. Але адразу ісці мне было лянотна, бо што ногі задарма стаптваць, і я вырашыў даведацца, што і як там працуе, праз Інтэрнэт. Знайшоў сайт гэтай рэкламнай канторы дый напісаў туды электронны ліст з пытаннямі «што, акрамя сябе любімага, захапіць» і «куды сябе любімага весці». Адказу доўга чакаць не давялося: мяне запрасілі з пашпартам і фатакарткай прывесці сябе ў аўторак у агенцтва. Цудоўна, чакаем аўторка.

### ЗАЯЎКА СВАЁЙ КАНДЫДАТУРЫ Ў ПРАМОЎТАРЫ

Жыццё так закруціла, што той самы аўторак ледзь не празяваў. Схамянуўся толькі за паўгадзіны, калі трэба быць на месцы. Мацаю рукой у кайстры — уф, пашпарт з сабою, — бяру ногі ў рукі і імчуся ў агенцтва. Паспеў. Нават зарана прыбег — яшчэ чакаў хвілін з пятнаццаць, пакуль прыйдзе спадарыня, якая непасрэдна займаецца падборам прамоўтараў. Пакуль сядзеў, агледзеўся: памяшканне агенцтва застаўлена сталамі, камп'ютарамі, а ўсё гэта ў сваю чаргу завалена рознымі ватманамі, макетамі ды іншым хламам, як тое і заведзена ў любым творчым калектыве. А вось і мае будучае начальства: да мяне кіруе маладая дзяўчына з паперчынай у руках, мабыць, анкетай. Ага, так і ёсць — вітаюся з начальствам і пачынаю запаўняць анкету. Нічога складанага: хто такі, дзе нарадзіўся, дзе вучышся, якія каардынаты ў пашпарце, ці ўдзельнічаў раней у акцыях, ці ўмееш катацца на роліках, навошта табе гэта патрэбна, што хочаш рэкламаваць, калі маеш вольны час для працы і г.д. Прыкладаю да анкеты сваю фатакартку (можна любую — ці як на пашпарт, ці з катом Мурзікам) і аддаю кампрамат на сябе ў надзейныя дзявочыя рукі. Засталося толькі прайсці невялічкі тэст: мая «начальніца» папрасіла стаць на хвілінку прамоўтарам і паспрабаваць «штурхнуць» любую рэкламную прамову. От, ну нельга ж так зняnацку! Але, здаецца, выкруціўся: працягваў свой пашпарт і нешта плёў пра самыя лепшыя чыпсы.

— Хопіць, хопіць! — перапыніла мяне дзяўчына. — Дзякуй, што прыйшлі да нас. Калі будзем ладзіць новую акцыю, то патэлефануем вам. Чакайце!

І, развітаўшыся, я адправіўся чакаць, мяркуючы, што прапануюць рэкламаваць; маянэз ці тэлевізары? А можа і наогул не патэлефануюць?..

### УРА! ПРАЦА ЗНАЙШЛАСЯ!

Прайшоў дзень. Мінуў другі. Трэці, чацвёрты... Тыдзень пралящеў. Я ўжо і забывацца пачаў пра сваё жаданне пабыць прамоўтарам. «Ай, ну не ўзялі, той добра... Перажыву!» — думаў сабе. Ажно аднойчы сяджу ў бібліятэцы, кніжкі разумныя чытаю, і тут на табе — на тэлефоне высвечваецца невядомы нумар. Вы правільна здагадаліся, то тэлефануюць з агенцтва і прапануюць рэкламаваць бытавую тэхніку. А па падрабязнасці і адразу на кастынг запрашаюць да сябе заўтра ўвечары. Ну што, прышоў мой зорны час?..

А вось і заўтра. Іду на кастынг. Трохі боязна, бо конкурсы заўсёды нервуюць. Заходжу ў агенцтва. А там ужо чакаюць чалавек з пятнаццаць юнакоў і дзяўчат. Саджуся ў свабоднае крэсла і пачынаю асцярожна аглядаць «канкурэнтаў». Хвалююцца ўсе: хто шапку ў руках камечыць, а хто з сябрамі нервова смяецца... Тут прыходзіць дзяўчына-«начальнік», пытаецца, ці ўсе сабраліся (ну адкуль жа мы гэта можам ведаць?), кажа, каб заходзілі па адным у суседні пакойчык на гутарку, і хаваецца сама за дзвярыма.

Першы пайшоў, а правільней сказаць — пайшла. Тры хвіліны ў невядомасці — і дзяўчына выходзіць. На тварыку — усмешка. Але на пытанні «ну што там?» адказвае неахвотна. Далей за дзвярыма па чарзе пачалі хавацца, а потым з'яўляцца адтуль астатнія кандыдаты ў прамоўтары. Пра што з імі гутарылі, не ведаю, а пра сябе раскажу.

Заходжу. Вітаюся. Сядаю на стульчык. І адказваю на пытанні: хто такі, навошта мне гэта трэба, ці спраўлюся, па якіх днях магу працаваць і г.д. У сваю чаргу мне расказваюць падрабязнасці акцыі — аказваецца, трэба будзе ў краме бытавой тэхнікі ўсяго толькі даводзіць пэўную інфармацыю да пакупнікоў. А я ўжо збіраўся нешта раздаваць ці кагосьці частаваць. Ну не дык не — буду «спічы» мовіць. Мне кажуць «дзякуй» і просяць не сыходзіць, а пачакаць, пакуль пагутараць з усімі кандыдатамі ў прамоўтары.

Нарэшце, выходзіць апошні чалавек. За ім — дзяўчына, што праводзіла гутарку. Яна называе імёны тых, каму трэба застацца (ура-ўра, мне таксама не трэба сыходзіць), а ў астатніх просіць прабачэння і запрашае прыходзіць яшчэ, на іншыя акцыі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# НОВЫЯ ПАГОНЫ



Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА

*Сёстры Таццяна і Вікторыя МАНЬКОЎСКІЯ атрымалі ўчора пагоны прапаршчыка пасля праходжання 5-месячнага навучання ў цэнтры па падрыхтоўцы прапаршчыкаў пагранічнай службы. Разам з імі такія ж пагоны атрымалі яшчэ 87 спецыялістаў пагранічнага кантролю.*

# Прэзідэнцкія стыпендыі — лепшым студэнтам

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Распараджэнне № 423рп «Аб зацвярджэнні рашэння савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў».**

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара, дакументам зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў. Са сродкаў фонду заахвочана 859 чалавек, аказана матэрыяльная дапамога 2 вучнёўскім навуковым таварыствам і студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Фізіка-хімічныя параметры рэчываў і працэсаў».

Кіраўніком дзяржавы назначана 96 стыпендый лепшым студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў і Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі. На іх выплату выдзелена Br96 млн.

Грашовымі прэміямі заахвочаны вучні, узнагароджаныя дыпломамі І—ІІІ ступені на заключным этапе Рэспубліканскай алімпіяды па агульнаадукацыйных прадметах 2007 года, пераможцы XVIII рэспубліканскага конкурсу навуковых біёлага-экалагічных работ, а таксама рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства 2007 года. Узнагароджаны грашовымі прэміямі ў памеры Br1705 тыс., Br1395 тыс. і Br1240 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду пераможцы XV Міжнароднай алімпіяды экалагічных праектаў, 18 прызёраў міжнародных прадметных алімпіяд 2007 года, 24 пераможцы Чацвёртай Міжнароднай алімпіяды па эканамічных, фінансавых дысцыплінах і пытаннях кіравання 2007 года.

Штомесячныя стыпендыі на 2008 год у памеры Br124 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду назначаны 5 пераможцам міжнародных прадметных алімпіяд 2007 года.

Аказана матэрыяльная дапамога студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, навуковым таварыствам устаноў адукацыі «Тэхналагічная гімназія № 13 г. Мінска» і «Гімназія № 50 г. Мінска». Кожнае з гэтых аб'яднанняў атрымае па Br9 млн для развіцця матэрыяльна-тэхнічнай і метадычнай базы. Прыняцце распараджэння з'яўляецца сведчаннем адраснай, мэтанакіраванай падтрымкі Кіраўніком дзяржавы адоранай моладзі. Гэта падтрымка накіравана на развіццё здольнасцяў вучняў і студэнтаў, стварэнне ўмоў для авалодання імі ведамі і навукова-даследчай работы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# СТУДЭНЦКІ РАЙ

**Добра, калі ў «пакутніка навукі» ёсць дах над галавою, няблага, калі маецца чым падсілкавацца, цудоўна, калі яшчэ і павесяліцца на славу атрымліваецца. А калі ўсё гэта даступна ў комплексе і не па «куслівым» кошце? Гэта ж сапраўдны студэнцкі рай, і самае цікавае, што рэальнасцю ён стане літаральна ў наступныя некалькі гадоў. Аквапарк і тэнісныя корты, боўлінг і рэстаран, цырульня і дыскатэка — і да ўсяго гэтага ад інтэрната — рукой падаць. Цяперашнія студэнты могуць толькі марыць аб такім, а для тых, хто прыйдзе ім на змену, гэта стане натуральным.**

Ну а пакуль грандыёзны жылы комплекс для студэнтаў — гэта толькі праект, давайце зазірнём у архітэктарскую майстэрню і даведаемся, як зменіцца ў хуткім часе аблічча паўднёва-заходняй часткі горада ў раёне праспекта Дзяржынскага ля Медыцынскага ўніверсітэта. У падарожжа па яшчэ не пабудаванай студэнцкай вёсцы (найменне па аналогіі з алімпійскай вёскай) выпраўляемся разам з **Галінай ПЕРЛІНАЙ з «Мінскпраекта» — галоўным архітэктарам праекта:**

— Праект сапраўды ўнікальны: аналагаў яму няма не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй тэрыторыі СНД. У нечым ён падобны на кампусы ў заходніх краінах, і безумоўна, гэты вопыт быў улічаны, аднак там будынкі групуюцца вакол універсітэта. У нас жа гэта самастойны жылы комплекс для студэнтаў самых розных універсітэтаў, пры гэтым ён дапоўнены такой інфраструктурай, якая зможа забяспечыць літаральна ўсе патрэбы моладзі. Дарэчы, інтэрнаты займаюць значна меншую тэрыторыю ў параўнанні з будынкамі забаўляльнага і сацыяльнага прызначэння.

Так, сапраўды, прасцей сказаць, чаго тут не будзе, чым пералічыць тое, што запланавана, аднак мы паспрабуем. Трэба нешта раздрукаваць ці зрабіць копію дакумента — калі ласка, ёсць жаданне ўладкавацца на працу — да вашых паслуг цэнтр занятасці, неабходна праверыць электронную пошту — вам у Інтэрнэт-кавярню, атрымаць стыпендыю — у аддзяленне банка, зрабіць пакупкі — у гандлёвы цэнтр, усім ахвотнікам асвяжыць прычоску — прамая дарога ў цырульню, грызці граніт навукі можна будзе ў бібліятэцы, а дзяліцца ведамі — у канферэнц-залах, калі ж раптам адчулі сябе дрэнна, вам дапамогуць у паліклініцы. Прынамсі, для аматараў здаровага ладу жыцця ёсць мноства спартыўных збудаванняў, у тым ліку крыты каток. Карацей, усё, што ні спатрэбіцца, у студэнцкай вёсцы ёсць, прычым размешчана вельмі кампактна, так што трапіць «з карабля на баль» тут будзе вельмі лёгка.

Тое, што аналагаў праекту няма, здавалася б, цудоўна: ёсць магчымасць стварыць нешта адмысловае, асаблівае, аднак не ўсё так проста. Першапраходніцкі аптымізм азмрочвае недахоп інфармацыі:

— Няма нарматыўных даных для праектавання жылых комплексаў такога тыпу. Скажам, як разлічыць, колькі спатрэбіцца месцаў для паркоўкі машын (сёння сярод студэнтаў даволі істотная доля аўтаўладальнікаў) і на якую колькасць дзяцей пабудаваць садок (нельга забываць пра маладыя сем'і)? Спрабуем планаваць колькасць паркоўкавых месцаў па аналогіі з адпаведнымі нормамі ў гасцініцах і санаторыях, пры гэтым не забываемся на тое, што машыны тут могуць пакідаць абслуговы персанал ды і звычайныя гараджане, якія змогуць свабодна карыстацца інфраструктурай студэнцкага комплексу — ні плотаў, ні прапускной сістэмы тут не плануецца. З улікам усіх гэтых акалічнасцяў мы заклалі ў праекце амаль удвая больш паркоўкавых месцаў у параўнанні з тым, што было прадугледжана дэталёвым планам, які распрацавалі спецыялісты «Мінскграда». Паводле нашай задумы, на тэрыторыі студэнцкага комплексу можна будзе прыпаркаваць звыш тысячы машын — на адкрытых аўтастаянках ці пад зямлёй.



Не меншыя, а мо і большыя спрэчкі ўзніклі пры падліках будучых наведвальнікаў дзіцячага садка, які, паводле праекта, прыбудаваны да аднаго з інтэрнатаў. Садок разлічаны на 60 месцаў, зноўтакі разлік, хутчэй, інтуітыўны:

— Калі ў звычайным жылым раёне ўстаноўлена, што на тысячу жыхароў патрэбна 150 месцаў у дзіцячай установе, то аналагічных паказчыкаў па колькасці дзяцей у студэнтаў няма.

І гэта далёка не ўсе пытанні, якія ўзнікалі падчас працы над праектам:

— Паводле нормаў, грамадскія збудаванні, разлічаныя на вялікую колькасць наведвальнікаў, павінны быць значна аддаленымі ад іншых аб'ектаў. Скажам, ад гандлёвага цэнтра павінна быць не менш за 50 метраў да ўсіх збудаванняў, што ёсць паблізу. Аднак на нашым участку мы ставім задачу як мага больш лакалізаваць аб'екты і зрабіць жылы комплекс насычаным разнастайнымі ўстановамі. Пры такой функцыянальнасці і кампактнасці мы не можам сабе дазволіць такую аддаленасць аб'ектаў. Даводзіцца ва ўсіх інстанцыях абгрунтоўваць неабходнасць гэтага і даказваць, што грамадскія збудаванні ў дадзеным выпадку не з'яўляюцца самастойнымі — яны ствараюцца спецыяльна для таго, каб абслугоўваць жыхароў найбліжэйшых будынкаў.

Пры ўсіх цяжкасцях было выкарыстана мноства цікавых, арыгінальных рашэнняў:

— Мы імкнуліся стварыць і, спадзяюся, нам гэта ўдалося, уласную планіровачную структуру, якая суадносілася б з навакольным ландшафтам. Комплекс размешчаны на магістралі праспекта Дзяржынскага, яна пакуль не забудавана так, як іншыя магістралі горада, і новы жылы комплекс дазволіць сфарміраваць фрагмент найноўшага і найбольш адпаведнага сучаснасці сталічнага праспекта. Таму дамінанта забудовы вынесена на перасячэнне праспекта Дзяржынскага і вуліцу «Чацвёртае кальцо» (працяг праспекта Любімава): 25-павярховы будынак інтэрната для аспірантаў і студэнтаў у комплексе з чатырохпавярховым кальцавым будынкам забаўляльнага цэнтра складае ўваходную групу. Структура дастаткова простая: галоўны структураўтваральны элемент — студэнцкая пешаходная алея, якая звязвае ўсе ключавыя зоны жыллёвага комплексу, — хвалепадобны, з мноствам навесаў. Паколькі паблізу студэнцкага комплексу размешчаны вадаём Лошыцкай воднай сістэмы, мы арганічна ўключаем яго ў агульную структуру. Рэльеф тут вельмі цікавы, і мы скарысталі гэта пры праектаванні. Справа ў тым, што ў зоне жылога комплексу ёсць пляцоўкі розных узроўняў: самая высокая — у раёне праспекта Дзяржынскага, а далей ідзе падзенне рэльефу ў бок вадаёма. Мы наўмысна не сталі рабіць плаўнага пераходу — так было б звыкла і стандартна, мы абралі тэрасаваную забудову. Самая нізкая тэраса — гэта паркавая зона, там будзе амфітэатр (студэнцкі форум) ля вады, атракцыёны, веласіпедныя дарожкі.

Веласіпед, дарэчы, будзе адзіным відам унутранага транспарту — будынкі размешчаны так кампактна, што ў грамадскім транспарце патрэбы няма. Уладкаванне паркавай зоны значыцца на апошнім месцы ў плане праекціроўшчыкаў. На сёння ж зацверджаны толькі першы этап праекта — эскізны праект забудовы.

— Ён яшчэ не прайшоў экспертызу, мы толькі ўзгаднілі яго ў Санэпідэмстанцыі, Міністэрстве экалогіі, Камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама. Будаўнічы праект мы пакуль не рабілі, аднак ужо зараз вядома, што першачарговым будзе інтэрнат БДУ — пакуль што адзіны імянны — ён заменіць універсітэту тую пляцоўку, што перайшла на баланс горада. Налета праектныя працы па гэтым інтэрнаце будуць, відаць, завершаны, а першых жыхароў ён зможа прыняць ужо ў 2009 годзе. Будаўнічы праект інфраструктуры, хутчэй за ўсё, таксама будзе выкананы налета: завершана чарнавая вертыкальная планіроўка, пракладзены магістральныя інжынерныя сеткі — пляцоўка будзе падрыхтавана да будаўніцтва. Далей усё залежыць ад таго, хто будзе заказчыкам і інвестарам. Ужо сёння вядома, што не ўсе аб'екты будуць фінансавацца з бюджэтных сродкаў: кампанія «Трайпл» возьме на сябе крыты каток (праектаванне даручана «Белпрампраекту») — гэта падарунак гораду. Астатнія спартыўныя збудаванні, гандлёвы і забаўляльны цэнтры таксама могуць стаць аб'ектамі інвестыцыйнага будаўніцтва. Сёння ўжо гатовы ўсе матэрыялы для таго, каб выстаўляць іх на конкурс інвестараў.

Усе аб'екты разам пры сваёй разнапланавасці ўтвараюць адзіны ансамбль. Тэрыторыя самога жылога комплексу займае больш за 20 гектараў, а калі ўлічыць паркавую зону, то атрымаецца ўдвая больш.

— Вызначыць стыль, у якім выкананы будынкі студэнцкай вёскі, даволі цяжка: хай-тэкам яго не назавеш, і ад класікі ён далёкі. Тут вельмі багата шкла, вітражоў. Каляровай гамай комплексу яшчэ займаемся, не хочацца стракатасці — пажадана, каб усе збудаванні былі больш стрыманымі па тону. Мы, спадзяёмся, будзем кантраляваць гэты працэс.

У студэнцкім квартале маюць шанцы атрымаць жыллё 8740 студэнтаў (1030 з іх будуць жыць у асобным інтэрнаце БДУ). Што іх чакае?

— Мы не ставілі сабе задачу пабудаваць нейкае элітнае жыллё, аднак пры гэтым у новых інтэрнатах жыць будзе вельмі камфортна і ўтульна. У структуры нам хацелася адысці ад традыцыйнай сістэмы калідорнага тыпу, так што прапанавана менавіта блокавая сістэма — ёсць жылая ячэйка, у якой размешчаны два ці тры пакоі, з уласным санвузлом і абавязкова светлай кухняй. Гэта прынцыпова новы момант у адрозненне ад звычайных інтэрнатаўскіх кухняў-нішаў. Ва ўсіх інтэрнатах ёсць сталовыя ці кавярні і мінімальны набор паслуг. Мінімальны, таму што ў інфраструктуры студэнцкай вёскі прадугледжаны будынкі рознага грамадскага прызначэння, а ўнутры інтэрнатаў — толькі самае неабходнае: кавярня ці сталовая, рамонт абутку ці медпункт. Усе інтэрнаты праектуюцца прыблізна з аднолькавым узроўнем камфортнасці, каб студэнты жылі ў роўных умовах. Самі жылыя пакоі афармляліся з разліку 6 квадратных метраў на чалавека, аднак з улікам плошчаў, адведзеных пад сацыяльную функцыю (асобных памяшканняў для заняткаў, холаў, зімовых садоў і г.д.), атрымліваецца значна больш — асабліва гэта датычыцца інтэрната для аспірантаў і студэнтаў: там гэты паказчык дасягае 16—18 квадратных метраў на чалавека.

Якая будучыня студэнцкіх вёсак? Ці стане студэнцкі рай нормай?

— На сёння ў сталіцы даволі сур'ёзны дэфіцыт месцаў у інтэрнаце. Натуральна, што будаўніцтва гэтага студэнцкага комплексу не вырашыць праблему цалкам. Паралельна мы вядзём праектаванне комплексу БНТУ, які размешчаны ў раёне праспекта Незалежнасці і Мінскай кальцавой дарогі. Там знаходзяцца 15-ы корпус БНТУ і тры інтэрнаты, мы займаемся праектам дэталёвага планавання гэтай зоны. Першапачаткова яна планавалася як другая пляцоўка для студэнцкага комплексу, аналагічнага таму, што праектуецца ў паўднёва-заходняй частцы горада. Аднак гэта крыху іншы праект — там сумяшчаецца вучэбны працэс і асяроддзе пражывання студэнтаў. Магчыма, нават і гэтай зоны будзе недастаткова для таго, каб забяспечыць жыллём усіх, хто прыязджае ў Мінск вучыцца. Не выключана, што з праекта студэнцкай вёскі на паўднёвым захадзе ўсё толькі пачынаецца.

**Ала МАЧАЛАВА.**

